УДК 745.52:351.852.13

# СПАДЧЫНА НАРОДНАГА ТЭКСТЫЛЮ ЯК SECOND HAND

***В. А. Лабачэўская,*** *доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжаны сферы выкарыстання прадметаў беларускага народнага тэкстылю ў гарадскім асяроддзі, аналізуюцца дыскурсы, якія суправаджаюць гэту практыку. Тканіны, створаныя ў хатніх умовах у сялянскім асяроддзі, аб’яднаныя паняццем «народны тэкстыль», трактуюцца як культурная і мастацкая спадчына. Другаснае ўжыванне разнастайных прадметаў народнага тэкстылю пазначана паняццем second hand («другія рукі»). Вылучаны практыкі музеефікацыі, камемарацыі, камерцыялізацыі і апсайклінгу ў сферы арт-практык.

**Ключавыя словы:** народны тэкстыль, спадчына, дыскурсы, камемарацыя, апсайклінг.

# HERITAGE OF FOLK TEXTILES AS SECOND HAND

***V. Labacheuskaya,*** *Doctor of Arts History, Associate Professor, Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the areas of use of Belarusian folk textiles in the urban environment, analyzes the discourses that accompany this practice. Fabrics created at home in the rural environment, united by the concept of «folk textiles», are treated as cultural and artistic heritage. Secondary use of various items of folk textiles is denoted by the «second hand» concept. The article highlightes such discourses as: museification, commemoration, commercialization and upcycling in the field of artistic practices.

**Keywords:** folk textiles, heritage, discourses, commemoration, upcycling.

Беларусь у XX ст. спазнала адзін з найбольш хуткіх працэсаў урбанізацыі ў Еўропе. Па перапісе 2019 г. у гарадах пражывае 77,5 % насельніцтва. Дэпапуляцыя вёскі, стварэнне аграгарадкоў і іншыя цывілізацыйныя працэсы ў Беларусі прыводзяць да масавага фізічнага знішчэння рукатворных прадметаў сялянскага побыту і толькі ў нязначнай ступені да іх музеефікацыі. У апошні час сфарміраваліся новыя практыкі выкарыстання вясковай аўтэнтыкі, заснаваныя на дыскурсе культурнай памяці (камемарацыі), камерцыялізацыі, а ў сферы сучасных мастацкіх практык і дызайну – сцвярджэнні права на творчую інтэрпрэтацыю.

Засяродзім увагу на народным тэкстылі – тканінах, прадметах адзення, якія ствараліся ў хатніх умовах з выкарыстаннем разнастайных тэхнік ткацтва і вышыўкі. У кожнай вясковай хаце мелася мноства самаробных тэкстыльных прадметаў, якія выкарыстоўваліся ў штодзённым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

побыце, абрадавых практыках, у традыцыйным соцыуме служылі мерай таленту жанчыны ў рукадзеллі, багацця і дабрабыту сям'і. З мастацкага пункту гледжання, спецыфікі гістарычнага развіцця гэта галіна народнага мастацтва разгледжана аўтарам у манаграфіі «Белорусский народный текстиль: художественные основы, взаимосвязи, новации» [2].

У артыкуле разглядаецца «другое жыццё» народнага тэкстылю, дыскурсы і практыкі яго выкарыстання па-за межамі сферы традыцыйнага бытавання. Другаснае ўжыванне разнастайных даматканых вясковых вырабаў (ручнікоў, посцілак і інш.) пазначана паняццем second hand («другія рукі») у амерыканскай традыцыі яго прымянення для вызначэння былой ва ўжыванні рэчы. Сучасная цывілізацыя развіваецца як урбаністычная, выціскае руральную культуру, знішчае яе аўтэнтычны «культурный пласт» ці адаптуе, прыстасоўвае яго артэфакты да патрэб гарадскога асяроддзя і новых культурных практык. Народны тэкстыль, выключаны з побыту вёскі, набывае новыя сэнсы, каштоўнасці, уключаецца ў іншыя дыскурсы сучаснай культуры.

Актуалізацыя ў беларускім грамадстве дыскурсу памяці і асэнсаванне гараджанамі другога-трэццяга пакалення сваёй генетычна-культурнай повязі з каранямі роду, з вёскай выяўляецца сярод іншага ў наданні прадметам вясковага тэкстылю статусу сямейнай рэлíквіі. Яны перавозяцца ў горад, захоўваюцца ў сем'ях як памяць аб маці, бабулі ці прабабулі і перадаюцца нашчадкам. Гэтыя звычайныя калісьці рэчы набываюць сімвалічную каштоўнасць матэрыялізаванай памяці роду і сувязі пакаленняў.

На дыскурсе памяці, узрастанні значнасці ў грамадстве культурнай спадчыны грунтуецца музеефікацыя народнага мастацкага тэкстылю. Традыцыйна назапашваюць і захоўваюць ручнікі, посцілкі, прадметы народнага касцюма дзяржаўныя музеі. Апошнім часам набыла пашырэнне практыка прыватнага калекцыянавання, стварэння прыватных музеяў як формы актуалізацыі культурнай памяці. Напрыклад, музей-кватэра «Старасвецкія карункі» ў Мінску сям'і паэткі Аксаны Спрынчан і экскурсавода, музыкі Яраша Малішэўскага. У сваіх вандроўках і падарожжах па Беларусі яны набываюць ручнікі, адзенне, посцілкі і іншыя артэфакты, прымаюць іх у дар ад знаёмых. Часта рэчы знойдзены і ўратаваны з пакінутых хат. У калекцыі ёсць унікальны па гістарычнай і культурна-антрапалагічнай інфармацыі артэфакт – ручнік з імем яго стваральніцы Марыі Зяньковай, датаваны 1914 г., з вышываным надпісам «Зло не верит, что на свете добро» і цікавым паведамленнем аб пачатку Першай сусветнай вайны і сведчаннем разгубленасці звычайнага чалавека перад гэтай навалай: «1914 года месяц август. Но не знаем, когда окончится, один Бог святы знае» [1]. Перыядычна праз старонку музея на Facebook яго ўладальнікі запрашаюць да сябе ў кватэру на экскурсіі.

Грамадскі запыт на рукатворныя тэкстыльныя прадметы, наданне ім новых сімвалічных сэнсаў увасаблення памяці роду і нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай спадчыны; фарміраванне ў грамадстве разумення рукатворнасці прадмета як самастойнай культурнай каштоўнасці, іх калекцыянаванне, а таксама камерцыялізацыя вясковых артэфактаў, якія ўсё шырэй выкарыстоўваюцца ў рэкламе, дызайне інтэр'ераў і экстэр'ераў для прыцягнення наведвальнікаў аб'ектаў харчавання, турызму, гандлю спарадзіла інстытут перакупшчыкаў, інтэрнэт-аўкцыёнаў і інтэрнэт-крам (ay.by, kufar.by), якія прапануюць творы народнага тэкстылю ў якасці тавару. Кошты не надта вялікія: сарочкі каштуюць 75–195 руб., фартух – 85, намітка – 40, ручнікі – 50–500, посцілкі – 36–60, ільняное палатно – 5 руб. за метр. Пераўтварэнню прадметаў вясковага тэкстылю ў тавар у немалой ступені садзейнічае іх надмерная колькасць ва аўтэнтычнай сферы бытавання, бо да нядаўняга часу ў кожнай хаце меліся дзясяткі самаробных мастацкіх тканін. Вывядзенне тэкстыльных прадметаў з традыцыйнай сферы ўжытку пасля сыходу з жыцця іх стваральніц і ўладальніц; разбурэння, перапродажу вясковых хат і іншых прычын нярэдка вядзе да іх знішчэння, камемарацыі ў сферы гарадской культуры ці вывядзення на рынак у якасці тавару, на які ёсць спажывецкі запыт.

Пераасэнсаванне народных тканін у якасці культурнай спадчыны, а таксама дасяжнасць іх узораў на рынку паспрыяла таму, што яны ўвайшлі ў сферу ўвагі сучасных арт-практык і дызайну адзення. Рукатворныя колішнія тканіны і прадметы адзення пачалі ўжывацца мастакамі ў якасці зыходнага матэрыялу, «сыравіны» для візуальнай артыкуляцыі індывідуальных творчых выказванняў. Пры гэтым практыкуюцца прыёмы татальнага пераўтварэння і перафармаціравання такіх артэфактаў, што вядзе да іх знішчэння. Такі падыход у свеце – трэнд самага апошняга часу, які грунтуецца на ідэалогіі экалогіі спажывецкай культуры. Ён атрымаў назву апсайклінгу (upcycling).

У беларускай культурнай прасторы гэты кірунак заявіў аб сабе праектам «Спадчына» маладой гродзенскай мастачкі Дар'і Сямчук (псеўданім «Цемра»). Твор-інсталяцыя пад назвай «Спадчына» быў прадстаўлены ў кастрычніку 2019 г. на выстаўцы «Восеньскі салон» у сталічным Палацы мастацтва і выклікаў вострую і неадназначную рэакцыю публікі. Мастачка выставіла 100-гадовую жаночую сарочку з вышыўкай крыжыкам (такія насілі на Заходнім Палессі, магчыма, у Кобрынскім раёне, у 1920-я гг.) і вышываны абрус, на якія зверху чорнай фарбай нанесла ўласны «мастацкі» тэкст – нечытальнае для гледача графіці, падобнае да таго, што можна ўбачыць у гарадской прасторы на сценах будынкаў, платах у якасці «выказванняў» падлеткаў і юнакоў. Гэта форма самавыяўлення адлюстроўвае ўніверсальную мову сучаснага стрыт-арту, якая не мае ні нацыянальнай формы, ні зместу.

Ідэю твора мастачка патлумачыла так: «Рубахе сто лет. Я ее купила, но очень недорого. Продавали как ненужное. Скатерть я нашла на свалке. Множество вопросов подтолкнуло меня к созданию этой работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я люблю старинные вещи и в то же время вижу, что люди от них избавляются. И не понимаю, как это возможно. Все действительно ценное уничтожается, а в дом приносится одноразовое, пластмассовое, безликое. Происходит подмена ценностей. Такими действиями люди разрушают наше наследие, культивируют бьюти-индустрию. Мне удивительно, что кого-то обидела моя работа. Я это вскрыла, показала визуально, материальными вещами, чтобы все заметили, что это так и происходит <...> Я хотела показать, что у нынешнего поколения совсем другие ценности. Надо ценить старое, а этого не происходит. И спустя время вот это черное будет нашим наследием» [3].

Як бачым, творчая інтэнцыя аўтаркі накіравана на сцвярджэнне каштоўнасці роднай спадчыны, за якую баліць яе душа, а брутальнасць формы мастацкага выказвання прыцягвае ўвагу грамадства да існуючай праблемы, абвастрае яе. Член журы «Восеньскага салона» Вольга Балашова, мастацтвазнаўца, намеснік дырэктара па развіцці Нацыянальнага мастацкага музея Украіны, станоўча ацаніла гэту працу: «Некалькі ўдзельнікаў сапраўды зачапілі. Я маю на ўвазе мастачку Цемру і яе праект «Спадчына»: ёсць асэнсаванне, якім чынам культурную спадчыну рабіць блізкай і зразумелай для новых пакаленняў, што ад яе ўсё больш аддаляюцца» [4]. Да такой ацэнкі схілілася большасць членаў міжнароднага журы выстаўкі, і Д. Сямчук атрымала галоўную ўзнагароду.

У «ахвяру» аўтарскай ідэі ў дадзеным выпадку прынесена прыгожая аўтэнтычная рэч, вартая музеефікацыі. Па-за ўвагай мастачкі засталіся такія складнікі каштоўнасці аўтэнтычнага твору, як марудная праца беларускай жанчыны-сялянкі па вырошчванні ільну, прадзенне, ткацтва палатна, вышыўка. Сучасная гарадская моладзь, незнаёмая з ручной працай, тэхналогіяй мастацкіх рамёстваў, комплексам міфалагічных уяўленняў і рытуальных практык, што суправаджалі стварэнне тэкстыльных прадметаў, мае абмежаванае разуменне каштоўнасці такой культурнай спадчыны. Асабліва гэта тычыцца народных тканін як увасаблення жаночай тэкстыльнай творчасці. Без усведамлення яе асноў і ўкаранёнасці ў традыцыйнай культуры немагчыма глыбока асэнсаваць культурную і мастацкую вартасць ручніка, посцілкі, народнага касцюма як музейных артэфактаў ці сямейнай каштоўнасці, інтэрпрэтаваць іх без страты першапачатковых сэнсаў. Без адукацыйных праектаў і папулярызацыі шматсэнсавасці такой культурнай спадчыны, актуалізацыі сямейнай камемарацыі ў дачыненні да народнага тэкстылю практыка апсайклінгу можа стаць звычайнай з'явай.

На абароне дыпломных праектаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў у 2021 г. выявіліся дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі пераасэнсавання народнага тэкстылю – second hand. Яна Лазоўская паказала калекцыю адзення «Грані магчымага» з народных даматканых посцілак. Двухкаляровыя посцілкі былі набыты праз інтэрнэт-краму kufar.by і разрэзаны на кавалкі, з якіх у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведнасці з кроем былі сабраны аб'ёмныя формы сукенак, паліто, штаноў. Швы канструктыўна падкрэслены ўстаўкамі бліскучай мішуры, каляровымі боа з пер'я марабу з інтэрнэт-крамы AliExpress. Вобраз атрымаўся кідкі, прыдатны для моладзевых клубных вечарын. Разам з тым татальнае пераўтварэнне рэчаў, якія мелі ўласную гісторыю, прызначэнне і былі па-мастацку прыгожыя ў кампазіцыі, спалучэнні колераў, выклікае непрыняцце, супраціў такога роду аўтарскай інтэрпрэтацыі, у выніку якой рэчы былі знішчаны.

Іншы ашчадны і камемаратыўны падыход да другаснага выкарыстання тэкстыльнай спадчыны прадэманстравала другая выпускніца кафедры Наста Рускевіч. Яе калекцыя адзення была зроблена з даматканага ільнянага палатна, якое зрабіла яе прабабуля і якое захоўваецца ў сям'і. Надаючы стараму палатну сучасную форму моладзевага адзення, малады дызайнер у канструкцыі, ашчадным дэкоры з абстрактных плямаў, нанесеных спосабам друку, які акцэнтуе фактуру і натуральны колер тканіны, у супастаўленні розных адценняў ільнянога палатна здолела ўвасобіць усведамленне каштоўнасці сямейнай спадчыны і годную павагу да яе.

Апісаныя практыкі другаснага выкарыстання народнага тэкстылю не існуюць ізалявана: у прасторы культуры і грамадскага спажывання яны ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Актуалізацыя ў сучасным грамадстве дыскурсу культурнай памяці ўводзіць іх у сферу навуковага інтарэсу і патрабуе далейшага вывучэння.


*1. Будовіч, Я.* Як жыць у музеі [Электронны рэсурс] / Я. Будовіч // Звязда. – 2021. – 8 мая. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/news/20210508/1620463540-ooo. – Дата доступу: 7.09.2021.

*2. Лобачевская, О. А.* Белорусский народный текстиль: художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 527 с.

*3.* Третий день сети ругаются из-за вышивки, которую якобы «осквернили» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://kyky.org/news/tretiy-den-sotsseti-rugayutsya-iz-za-vyshivanki-kotoruyu-yakoby-oskvernili?fbclid=IwAR1JilFyec3a-qPnW4VYrzSrsM54oMeh9GOQq1oi7viR4TLEd_2yCgmBeOk. – Дата доступа: 10.11.2019.

*4. Цімошык, Л.* Візуальная ўМОЎНАСЦЬ. «Асенні салон» вачыма экспертаў [Электронны рэсурс] / Л. Цімошык. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/be/news/20191101/1572622064-vizualnaya-umounasc-asenni-salon-vachyma-ekspertau?fbclid=IwAR1s0DN9lldF73OZ9AcwTp8Szya0GKvG6KcumaPvPT5AzosKBCH9aV5yKwM. – Дата доступу: 10.11.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ